# СУЧАСНЫ ШКОЛЬНЫ ПАДРУЧНІК ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ: МЕТАДЫЧНЫЯ ДАМІНАНТЫ

*Л.С. Васюковіч*
*Віцебск, Віцебскі філіял*
*Міжнароднага ўніверсітэта «МІТСО»*

*Мэта артыкула*: абгрунтаваць змест і структуру кампанентаў вучэбнага тэксту як метадычных дамінантаў сучаснага школьнага падручніка. *Актуальнасць даследавання* абумоўлена неабходнасцю тэарэтычнага асэнсавання, запатрабаванасцю адукацыйнай практыкай пытанняў распрацоўкі вучэбных выданняў. Тэхналагічныя змены, што адбываюцца ў сучасным свеце, уплываюць на абнаўленне падыходаў у сферы адукацыі. Адным з актуальных трэндаў сённяшняй адукацыі стала фарміраванне ўніверсальных якасцей навучэнцаў, навыкаў XXI стагоддзя, “soft skills” сродкамі вучэбнага тэксту школьнага падручніка [2, с.143].

**Матэрыял і метады.** Улічваючы спецыфіку моўнай адукацыі, структуру пазнавальнай дзейнасці пры чытанні, аналізе, інтэрпрэтацыі і стварэнні вучэбных тэкстаў, выкарыстоўваліся наступныя групы метадаў фарміравання прадметных і метапрадметных уменняў: метады, што забяспечваюць *матывацыю і арыенціроўку* ва ўмовах тэкставай дзейнасці; метады, скіраваныя на *арганізацыю тэкставай дзейнасці*; метады *кантролю, самакантролю, рэфлексіі* ў працэсе стварэння тэкстаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** *Сучасныя адукацыйныя вынікі* сродкамі вучэбнага тэксту фарміруюцца праз сістэму кампанентаў школьнага падручніка па беларускай мовы: мэтава-каштоўнаснага, кагнітыўна-зместавага, дзейнаснага і рэфлексійнага. *Мэтава-каштоўнасны кампанент* сучаснага вучэбнага тэксту рэалізуецца праз матывацыйныя ўмовы і заданні, арыентаваныя на самастойную дзейнасць навучэнцаў, актуалізацыю спосабаў універсальных дзеянняў, планаванне шляхоў вырашэння пазнавальнай праблемы, аналіз патэнцыяльных цяжкасцей пры выкананні заданняў. Сучасныя даследчыкі (В.І. Байдэнка, В.А. Болатаў, А.Д. Дзейкіна, В.Л. Жук, І.А. Зімняя і інш.) падкрэсліваюць прыярытэт фарміравання асобасных установак: «Менавіта каштоўнасці і матывацыя прадвызначаюць праяўленне адказнасці, ініцыятыўнасці, скіраванасці на вынік, крэатыўнасць» [3, с. 11].

Мэтава-каштоўнасны кампанент вучэбнага тэксту закліканы фарміраваць устойлівую матывацыю да пазнання, самаразвіцця, самавызначэння. З гэтай прычыны фармулёўка заданняў як *матываў-стымулаў* выступае сігналам для прачытання, нагадвае сцісла сфармуляваную праблему, асноўную думку, ідэю. Такія заданні, як правіла, матывуюць да асэнсаванай пазнавальнай дзейнасці праз:

– рытарычныя пытанні: *хто не задумваўся над праблемамі эфектыўнай прамовы?*;

– спасылкі на прызнаныя аўтарытэты: *яшчэ Якуб Колас падкрэсліваў значнасць пісьмовага маўлення вучняў*;

– выкарыстанне цытат, эпіграфаў, цікавых фактаў, дат: *невыпадкова Максім Багдановіч нагадваў пра тое, што «ўсе мы разам ляцім да зор»*;

– указанне на значнасць праблемы, разгорнутай у тэксце: *адно з самых важных пытанняў сучаснай лінгвістыкі заключаецца ў ...*;

– прагназаванне зместу тэксту перад чытаннем на аснове назвы, плана, структуры, ключавых слоў: *разгледзьце схему і выкажыце здагадку, якую інфармацыю разгортвае вучэбны тэкст*;

– фармулёўку інструктыўнай часткі задання як мэты-выніку чытання вучэбнага тэксту: *прачытайце тэкст-інтэрв'ю з Аляксеем Дударавым і падрыхтуйце аргументаванае паведамленне пра навізну бачання драматургам праблем інфармацыйнага грамадства*; *прачытайце тэкст і зафіксуйце яго змест у выглядзе цытат аўтара па асноўнай праблеме*.

*Кагнітыўна-зместавы кампанент* тэксту рэалізуецца ў сучасным кантэксце праз засваенне працэдурных ведаў і ўменняў у выніку асэнсаванай пазнавальнай дзейнасці. Пра ўзровень сфарміраванасці кампетэнцый можна меркаваць праз сукупнасць уменняў і навыкаў, якія выяўляюцца ў разнастайных вучэбных і жыццёвых сітуацыях. Кагнітыўна-зместавы кампанент вучэбнага тэксту можа быць дэталізаваны праз наступныя ўменні:

– *дыялагічныя*. Як вядома, дыялагічныя зносіны як форма ўзаемадзеяння «заснаваны на пэўных каштоўнасцях, да якіх адносяцца раўнапраўнасць суразмоўнікаў і незавершанасць дыялогаў» [1, с. 58]. Уменне будаваць дыялог падкрэслівае каштоўнасць слова, мовы, культуры, чалавечых узаемаадносін. Паўнацэнныя дыялагічныя ўменні развіваюцца ў тым выпадку, калі адукацыйны працэс выбудоўваецца ў рэжыме ўзаемаразумення і павагі да суразмоўцаў. Мадэляванне дыялагічнага маўлення як асновы пазнання забяспечвае развіццё асобы, здольнай супрацоўнічаць, планаваць і арганізоўваць сумесную працу над праблемай (вучэбнай, жыццёвай) у малых і вялікіх групах, у соцыуме;

– *аргументатыўныя ўменні,* скіраваныя на доказ або абвяржэнне пэўнага палажэння, пазіцыі, неабходныя для пабудовы несупярэчлівых выказванняў. Веданне структуры аргументацыі (тэзіс, аргумент/доказ, вывад) дапамагае аналізаваць, тлумачыць, параўноўваць інфармацыю, устанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі паміж фактамі і з'явамі. Аргументацыя як пазнавальная працэдура неабходная для пабудовы лагічных, доказных выказванняў, фармулявання пазіцыі, ацэнкі, вывадаў пры вывучэнні любога школьнага прадмета.

Змест *дзейнаснага кампанента* вучэбнага тэксту актуалізуецца праз тэхналогіі дзейнаснага тыпу (праблемныя, дыялагічныя, тэхналогіі ацэньвання, асэнсаванага чытання), з дапамогай якіх веды не паведамляюцца ў гатовым выглядзе, а фармулююцца праз задачу, праблему, якія неабходна вырашыць, выбраўшы для гэтага рацыянальны і аптымальны спосаб. На

думку Н.Ф. Талызінай, неабходна планаваць дзейнасць навучэнцаў па арганізацыі засваення ведаў з мэтай дасягнення вынікаў не толькі ў выглядзе сукупнасці ведаў, але і ў выглядзе праграмы дзеяннняў [4, с. 184]. Узрастае доля самастойнай дзейнасці, асноўнай прыметай якой выступае не тое, што навучэнец працуе без дапамогі педагога, а тое, што кожнае дзеянне ўсведамляецца навучэнцам, падпарадкоўваецца сфармуляванай мэце. У кантэксце сучасных дапаможнікаў узрастае роля *даследчых уменняў*, праектнага навучання, вучэбна-даследчай працы. Такія формы арганізацыі пазнавальнай дзейнасці выступаюць эфектыўнымі прыёмамі развіцця аналітычных здольнасцей, творчага мыслення.

Дзейнасны падыход прадугледжвае фарміраванне *рэфлексійнага кампанента* вучэбнага тэксту ў якасці прыярытэтнага. Змест рэфлексійнага кампанента фарміруе ўменні ацэньваць выніковасць уласных вучэбных дзеянняў, устанаўліваць прычыны поспехаў і няўдач, выяўляць і выпраўляць дапушчаныя памылкі, аналізаваць іх. Рэфлексійныя ўменні знаходзяцца ў аснове самастойнай кантрольна-ацэначнай дзейнасці.

**Заключэнне.** Такім чынам, метадычныя дамінанты сучаснага вучэбнага тэксту школьнага падручніка праецыруюць інтэграванасць кампанентаў (мэтава-каштоўнаснага, кагнітыўна-зместавага, дзейнаснага, рэфлексійнага), якія сукупна рэалізуюць новыя аспекты сучаснай моўнай адукацыі:

– асэнсаванне ролі роднай мовы як інструмента пазнання, які фарміруе інтэлектуальна-маўленчыя каштоўнасці, стымулюе пазнавальную актыўнасць і ініцыятыву навучэнцаў (*мэтава-каштоўнасны кампанент*);

– інфармацыйнае абнаўленне прадметнага зместу тэксту, фарміраванне дыялагічных, аргументатыўных, даследчых уменняў (*кагнітыўна-зместавы кампанент*);

– прыярытэт дзейнаснай асновы фарміравання прадметных і метапрадметных кампетэнцый, разнастайнасць спосабаў дзейнасці – аналітычных, рэпрадуктыўных, прадуктыўных; рэгулятыўных, камунікатыўных, рэфлексійных – навучэнцаў (*дзейнасны кампанент*);

– ацэньванне выніковасці ўласных дзеянняў, устанаўленне прычын вучэбных поспехаў і няўдач, выяўленне і выпраўленне дапушчаных памылак, іх аналіз (*рэфлексійны кампанент*).

1. Библер, В. С. На гранях логики культуры: книга избранных очерков / В. С. Библер. – М.: Русское феноменологическое общество, 2007. – 440 с.
2. Васюковіч, Л. С. Фарміраванне прадметных і метапрадметных кампетэнцый навучэнцаў сродкамі ўніверсальнага вучэбнага тэксту: манаграфія / Л. С. Васюковіч. – Віцебск: ВДУ імя П. М. Машэрава, 2021. – 224 с.
3. Жук, О. Л. Актуальные направления развития образования и научно-педагогических исследований в условиях цифровой трансформации / О. Л. Жук // Педагогика. – 2020. – № 3. – С. 5–13.
4. Талызина, Н. Ф. Педагогическая психология : учеб. пособие / Н. Ф. Талызина. – 9-е изд., стер. – М. : Академия, 2013. – 288 с.